# Анатоль Сыс

(26 кастрычніка 1959- 4 траўня 2005)

Пайду туды, адкуль прыйшоў
па-за зямлёю, па-за часам.
Я тут нічога не знайшоў,
хаця сваю і выпіў чашу.


...памірай, а жыта сей.
Рунь пра сейбіта раскажа.
Анатоль Сыс



- Анатоль Цізанавіч Сыс, нарадзіўся 26 кастрычніка 1959 года у вёсцы Гарошкаў, Рэчыцкага раёна, Гомельскай вобласці. Быў найменшым з чатырох дзяцей у сям'і Марыі й Ціхана Сысоў. У 1977 годзе ён паступіў на гісторыка-філялягічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Ф. Скарыны, які скончыў у 1982 годзе. Пасьля двухгадовай службы ў войску сувязістам у Польшчы працаваў у Веткаўскай раённай газэце «Перамога Кастрычніка». У 1985 годзе Сыс пераехаў у Менск, дзе працаваў старэйшым спэцыялістам на Беларускім тэлебачаньні.



- Свой першы верш па-беларуску Анатоль Сыс напісаў падчас навучаньня ў Броненскай сярэдняй школе з расейскай мовай навучаньня. У 1974 годзе дэбютныя творы Сыса былі надрукаваныя ў рэчыцкай раённай газэце «Дняпровец».[2]
- У 1986 падборка вершаў Анатоля Сыса была надрукаваная ў часопісе «Маладосьць». У 1987 годзе Сыс быў сярод заснавальнікаў суполкі маладых пісьменьнікаў «Тутэйшыя». Пры жыцьці паэта выйшлі тры зборнікі ягоных вершаў:
- *Агмень* (1988)
- *Пан лес* (1989)
- *Сыс*[3] (2002)

- Пэрыяд найбольш плённай творчасьці прыпаў на канец 1980—пачатак 1990 гадоў. Амаль увесь наклад першага зборніка «Агмень» быў раскуплены за некалькі тыдняў, а зборнік «Пан Лес» стаў самым вядомым зборнікам паэта. Ад сярэдзіны 1990-х гадоў і да сваёй сьмерці новыя творы Анатоль Сыс амаль не пісаў. Улюбёнымі вобразамі Анатоля Сыса былі сэрца, і агонь, агмень.




- назва «Агмень» была мэтафарай Радзімы, часьцінкай радзімы, якую паэт насіў пры сабе падчас службы ў войску. Гэтае слова Сыс знайшоў толькі ў «Расейска-Крыўскім (Беларускім) слоўніку» Вацлава Ластоўскага, і, мяркуючы, што адзін з абавязкаў пісьменьніка — вяртаньне сябе праз вяртаньне страчанага народам, вырашыў назваць першы зборнік менавіта такім чынам.


Анатоль Сыс
БЕРАГІ
майго юнацтва

зборнік «Пан Лес» стаў самым вядомым зборнікам паэта.





- **Постаць Сыса лічыцца супярэчлівай: яго пры жыцьці называлі геніем, але прага паэта да спантанных публічных пэрформансаў і любоў да шумных вечарын, дзе алькаголь ліецца ракою, многіх абурала.**



- Напачатку 1990-х гадоў Кася Камоцкая запісала некалькі песень на вершы Анатоля Сыса, сярод якіх «Мая белая лебедзь», «Ластаўка», «Залатыя краты». Апошняя песьня стала гітом і цяпер уваходзіць у клясыку беларускай рок-музыкі.




- Пасьля сьмерці Анатоля Сыса штогод у кастрычніку на ягонай радзіме ў Гарошкаве ладзіцца традыцыйнае сьвята паэзіі ў гонар паэта,у якім бяруць удзел родныя і землякі Анатоля, ягоныя сябры, а таксама вядомыя беларускія паэты, барды і мастакі.


У гэтай хаце
нарадзіўся, жыў
і тварыў
вялікі беларускі
паэт
Анатоль Сыс

# Цікавыя факты з жыцця паэта

- Калі маці Анатоля Сыса была ім цяжарная, яна, дапамагаючы суседцы надвячоркам падліць газы ў запаленую лямпу, з-за неасьцярожнасьці ўчыніла пажар і абгарэла. У тую ж самую ноч нарадзіўся Анатоль.[15]
- Анатоль Сыс лічыў, што беларуская мова павінна стаць дзяржаўнай у рэспубліцы, а ўсе праграмы аб разьвіцьці двухмоўя ў Беларусі называў «працягам той дывэрсіі, якую задумаў яшчэ Сталін са сваімі марыянэткамі». Як вынік, Сыс забараніў перакладаць свае вершы на расейскую мову да часу, пакуль беларуская мова ня стане раўнапраўнай сярод усіх моваў СССР.[4]
- Помнік на магіле Анатоля Сыса, зроблены Гэнікам Лойкам, важыць амаль 700 кіляграмаў, а праца над ім вялася амаль год




- **Памёр 4 траўня 2005 году ў сваёй менскай кватэры ад сардэчнага прыступу. Пахаваны ў Гарошкаве. Сям'і ў паэта не было**

# Анатоль Сыс чытае верш на "Басовішчы" 1992



# Адпусціце мяне курапаты

